**Брестский филиал
РУП "Институт недвижимости и оценки"
извещает о проведении повторного
открытого аукциона**

**Лот №1:**

1) **капитальное строение** с инвентарным номером 150/С-23374 (наименование: Дом животноводов МТФ № 3; назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения), площадью 259,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 43/4, вблизи д. Борки, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001268 площадью 6,9133 га, составные части и принадлежности: а-Септик, б-Асфальтированная площадка, в-Бетонная площадка, г-Металлическое ограждение;

2) **капитальное строение** с инвентарным номером 150/С-23373 (наименование: телятник МТФ № 3; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 895,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 43/2, вблизи д. Борки, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001268 площадью 6,9133 га;

3) **капитальное строение** с инвентарным номером 150/С-23372 (наименование: коровник МТФ с молочным блоком; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 1776,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 43, вблизи д. Борки, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001268 площадью 6,9133 га;

4) **капитальное строение** с инвентарным номером 150/С-23370 (наименование: коровник МТФ № 3; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 1514,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 43/1, вблизи д. Борки, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001268 площадью 6,9133 га;

5) **капитальное строение** с инвентарным номером 150/С-23365 (наименование: коровник МТФ № 3; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 1282,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 43/3, вблизи д. Борки, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001268 площадью 6,9133 га

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 135 864,00 | Размер задатка, руб. | 13 586,40 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Вульковский рассвет», 225666 Брестская обл., Лунинецкий р-н, аг. Вулька-2, ул. Советская, 31, тел./ф 80164796393. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки", г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** до 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** Покупателю предоставляется рассрочка оплаты приобретенного на торгах имущества на срок до 24 (двадцати четырех) месяцев. Оплата приобретенного в рассрочку на торгах имущества производится в следующем порядке: - аванс в размере 30 % (с учетом ранее внесенной суммы задатка) уплачивается в течение 20 (двадцати) календарных дней с момента заключения договора по результатам торгов; - 70 % равными долями в течение 24 (двадцати четырех) месяцев с момента передачи имущества. Ежемесячная сумма рассрочки не индексируется. Ежемесячный платеж осуществляется не позднее 25 числа каждого месяца, следующего за месяцем передачи имущества. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 11 февраля 2025 г. в 11.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 09.00 до 17.00. Последний день приема заявлений — 10 февраля 2025 г. до 17.00**



ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного открытого аукциона

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – **06 февраля 2025 года в 11-30** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 40% без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 2 | Экскаватор гусеничный JCB JS220SC, заводской номер JCBJS220CA61203762, год выпуска 2006, регистрационный знак ТК-6 3057, инвентарный номер 654 | 61200,00 | 6120,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **06 февраля 2025 года в 11.30** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утверждённое приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **31.01.2025 г., время: 17.00**.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

9. Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 12.11.2024 и на сайце ОАО «ДСТ № 3».


# У АДКАЗЕ ЗА БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На выбарчым участку № 16, які размешчаны ў сталіцы на базе Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, сярод выбаршчыкаў пераважае моладзь. Многія галасуюць упершыню. Па інфармацыі Цэнтральнай выбарчай камісіі, першы раз у галасаванні прыме ўдзел больш як 88 тысяч выбаршчыкаў. Для іх Цэнтрвыбаркам традыцыйна падрыхтаваў падарункі — кнігу «Сімвалы суверэннай Беларусі» і футболку з надпісам «Мой голас ПЕРШЫ!».

Як прызнаюцца маладыя выбаршчыкі, гэтая падзея запомніцца ім на ўсё жыццё. Студэнт Арцём Гардзіевіч вырашыў прагаласаваць датэрмінова, каб у выхадныя дні паехаць дахаты. Малады чалавек прызнаецца: падчас ажыццяўлення свайго грамадзянскага абавязку адчувае найвялікшую адказнасць. «Усё залежыць ад кожнага чалавека: мой голас — пэўны ўнёсак у лёс краіны, — кажа Арцём. — Усе павінны скарыстацца сваім правам галасавання. Мы павінны ведаць, што больш за ўсё хваліе народ».

Для другакурсніка ўніверсітэта Максіма Есіповіча гэта таксама першыя выбары. «Вельмі хвалююча рабіць такі важны выбар першы раз, — прызнаецца ён. — Мы ўсе адказныя за будучыню сваёй краіны, адпаведна, лічу, што важны голас кожнага». Па яго словах, вельмі зручна, што прадугледжана датэрміновае галасаванне. «Можна пазбегнуць вялікай чаргі і ў асноўны дзень запланаваць нешта іншае», — патлумачыў малады чалавек.

Як і ўсе выбаршчыкі, хто галасуе ўпершыню, Арцём і Максім атрымалі ад членаў выбарчага ўчастка футболку з надпісам «Мой голас ПЕРШЫ!» і падарункавае выданне «Сімвалы суверэннай Беларусі». Футболкі ўжо паспяшаліся памераць. Кнігу, вядома, пагарталі. Асабліва спадабалася выкарыстанне QR-кодаў, дзякуючы якім можна больш падрабязна азнаёміцца з сімваламі Беларусі: напрыклад, адправіцца на экскурсію па Мірскім замку.

За працэсам сочаць нацыянальныя назіральнікі. Адзначаюць, што з першых хвілін адкрыцця выбарчага ўчастка



маладыя людзі актыўна прымаюць удзел у галасаванні. «Хтосьці ў нядзелю будзе не ў Мінску, у кагосьці — праца, іншыя справы, — тлумачыць нацыянальны назіральнік. — Усё праходзіць у адпаведнасці з заканадаўствам, у спакойнай і нават святочнай абстаноўцы».

Сакратар участковай камісіі № 16 Алена Андрэеўна ўдакладніла, што з самага пачатку электаральнай кампаніі маладыя людзі звярталіся ў камісію з пытаннямі. «Адкрытыя дыялогі, якія праводзіліся на базе нашага ўніверсітэта, далі магчымасць зрабіць маладым людзям правільны выбар», — падкрэсліла яна. Плануецца, што на дадзеным участку ўпершыню ў галасаванні прыме ўдзел больш як 250 студэнтаў.

З пытаннямі ў камісію звяртаецца не толькі моладзь. Тэлефануюць прадстаўнікі розных узроставых катэгорый, задаюць пытанні, якія іх цікавяць. У прыватнасці, па пэўных прычынах (у асноўным з-за праблем са здароўем) просяць наведаць па месцы жыхарства ў асноўны дзень галасавання для таго, каб і ў іх была магчымасць выканаць свой канстытуцыйны абавязак.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# ЗА МІРНАЕ НЕБА І КВІТНЕЮЧУЮ БЕЛАРУСЬ

## Моладзь Магілёўшчыны ведае, за што яна галасуе

У першы дзень датэрміновых выбараў у фае Беларуска-Расійскага ўніверсітэта (БРУ), дзе размясціўся ўчастак для галасавання № 1 Ленінскага раёна Магілёва, ужо з раніцы панавала ўрачыстая атмасфера. У спісах тых, хто галасуе, на гэтым участку 1668 выбаршчыкаў, 13 з іх — упершыню.

За 10 хвілін да пачатку галасавання дэманструецца, што празрыстая скрыня для датэрміновага галасавання пустая, і апячатваецца членамі ўчастковай камісіі пад кантролем назіральнікаў. У 12.00 першы выбаршчык бярэ бюлетэнь. Ім стала студэнтка першага курса МДУ імя А. Куляшова Дар'я Ніжагародава. Для яе гэтая важная падзея адбылася ўпершыню.

На твары Дар'і — пачуцці лёгкага хвалявання, гонару, задавальнення. Выбар — гэта вельмі адказна. Дзяўчына прымае віншаванні і падарункі. Ёй уручаюць брашуру з сімваламі суверэннай Беларусі, значок і футболку ад БРСМ з красамоўным надпісам «Мой голас — першы!».

— Сёння адбыўся вельмі важны момант у маім жыцці, — голас дзяўчыны крыху дрыжыць, на шчоках — лёгкі румянец. — Я прагаласавала за стабільнасць, суверэннасць, за квітнеючую Беларусь.



У дзень пачатку датэрміновых выбараў падтрымаць тых, хто галасуе ўпершыню, прыехала ў Магілёў заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь у перыяд з 1996 да 2021 года Лідзія Ярмошына. На сустрэчу з ёй у БРУ прыйшлі 300 прадстаўнікоў навучэнскай моладзі.

— Самае галоўнае — данесці да маладых людзей, якія ўпершыню ідуць галасаваць, як важна не памыліцца з выбарам, — адзначыла Лідзія Мікалаеўна ў размове з журналістамі. — А каб выбар быў усвядомлены і адказны, трэба разумець, хто такі Прэзідэнт, якая яго роля і як многа залежыць ад выбаршчыкаў. Што датычыцца працэдуры галасавання, то яна простая і не патрабуе асаблівых навыкаў. Моладзі трэба нагадаць пра тое, каб яна не паўтарыла памылак 2020 года, каб не гналася за лжывымі палітычнымі каштоўнасцямі і ідэаламі.

Размова Лідзіі Ярмошынай з моладдзю працягвалася паўтары гадзіны. Спікер нагадала важную ісціну: нельга чагосьці патрабаваць ад краіны, калі сам нічога для яе не зрабіў. Выбары — якраз той самы шанц падтрымаць радзіму.

— Мы можам доўга разважаць пра тое, што такое патрыятызм, — адзначыла спікер. — Але сэнс адзін — гэта калектыўная адказнасць за краіну. Галоўнае права чалавека — права на бяспечнае жыццё. Давайце берагчы тое, што ёсць.

Сярод тых, хто галасаваў упершыню, — студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій (БДУТ) Андрэй Шэндрыкаў. Ён лічыць, што ўдзел у выбарах — гэта вельмі важна і адказна.

— Прыйсці і прагаласаваць — мой грамадзянскі доўг, — паведаміў Андрэй. — Хочацца, каб наша краіна была моцнай і незалежнай.

Паліна Калтунова — таксама студэнтка БДУТ, чалавек актыўнай жыццёвай пазіцыі, член БРСМ.

— Для мяне вельмі хвалююча ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, — прызналася дзяўчына. — Гэта падзея заўсёды была асаблівай у нашай сям'і. Раней я хадзіла на выбары з маці, назірала, як усё адбываецца. Здавалася, што нічога складанага няма. А вось зараз трэба будзе рабіць выбар самастойна, і гэта вельмі адказна. Галоўнае, каб мірнае неба было над галавой заўсёды.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**